Ганчарова-Цынкевіч Т.У.
(г. Мінск, БДПУ)

# Філасофія чалавечай існасці ў «Казках жыцця» Якуба Коласа

У асобе Якуба Коласа спалучаўся талент паэта і празаіка. Яшчэ на пачатку XX стагоддзя Я.Колас выступіў з цэлым шэрагам апавяданняў (зборнікі «Апавяданні» (1912), «Родныя з'явы» (1914)) і такім чынам стаў ля вытокаў нашай мастацкай прозы. Проза пісьменніка той пары ў ідэйна-тэматычным плане і вобразнай структуры зближалася з яго паэзіяй: аб'ект адлюстравання – жыццё і побыт беларускага сялянства, герой – жыхар вёскі са сваімі клопатамі і звычкамі. Вялікую цікавасць у гэтым плане ўяўляе арыгінальны цыкл апавяданняў пад агульнай назвай «Казкі жыцця», дзе падымаюцца важныя сацыяльна-палітычныя, філасофскія, маральныя і этычныя праблемы таго часу. Апавяданні, сабраныя ў цыкл «Казкі жыцця», па сваім жанры належаць да алегорый. Пісаліся яны на працягу паўстагоддзя (з 1907 г. па 1956 г.) і належаць да тых твораў, якія Я. Колас лічыў найбольш значнымі ў сваёй творчасці. «Казкі жыцця» былі тым жанрам, які даваў магчымасць гаварыць эзопавай мовай пра такія рэчы, пра якія нельга было адкрыта згадваць у дарэвалюцыйны час. Як вядома, байка грунтуецца на тым, што дзеючыя асобы ў ёй – жывёлы, птушкі, расліны – нясуць на сабе замацаваныя ў народнай свядомасці якасці. Пісьменніку-байкапісцу няма патрэбы характарызаваць, напрыклад, лісу, якая выступае сімвалам хітрасці, ці мядзведзя – сімвал моцы і сілы. У пэўнай меры на гэтай заканамернасці і трымаюцца Коласавы алегорыі, хоць ён і значна пашырае кола сваіх казачных персанажаў. Трэба яшчэ адзначыць, што ў «Казках жыцця» мастак слова выразна трымаецца фальклорных традыцый. Творы гэтага цыкла вытрыманы ў духу нацыянальных беларускіх казак. Аднак усе гэтыя алегарычныя апавяданні з'яўляюцца арыгінальнымі аўтарскімі творамі, куды пісьменнік уводзіў свае невядомыя фальклору вобразы, матывы і сюжэты.

У адной з першых па часе напісання казцы «Жывая вада» (1907) сцвярджаецца мара чалавека аб шчаслівым жыцці. У казачнай краіне, пра якую ідзе аповед у творы, «… вольна жылося людзям у той краіне. Ніхто іх не гнаў, ніхто іх не крыўдзіў, нікому яны не належалі. Багатая, урадлівая была іх зямля. Шырока раскінуліся іх палі, зялёныя травы сенажацей калыхаліся на ветры. Ціха і весела смяяліся кветкі…» [1, с.3]. І вось у гэтым кутку зямлі, адкуль выцякала жывая вада, пачала расці гара, якая паступова ператварыла шчаслівы край у «мёртвае поле». Праходзілі стагоддзі, зямля плакала горкімі слязьмі. І прыйшоў час, калі цярпенню людзей і няшчасцю зямлі прыйшоў канец. «Усё жывое дрыжала ад страху і чакала пагібелі. Але згінула адна гара. Пяском і дымам развеялася яна на полі» [1, с.6].

У алегарычнай форме аўтар сцвярджае, што, якім бы жорсткім не быў прыгнёт, увасоблены ў вобразе гары, прыйдзе канец народнаму цярпенню і будзе знішчаны ён.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Аўтар твора не сумняваецца ў тым, што эксплуататарскі лад не ў сілах спыніць рух жыцця наперад. У алегорыі «Жывая вада» Я. Колас праводзіць ідэю магутнасці народа, які застаецца свабодалюбівым і ў гады самага дзікага прыгнёту і самавольства. Пісьменнік гаворыць, што барацьба прыгнечаных супраць эксплуататараў жыццёва апраўдана, бо яна вядзецца ў імя свабоды чалавека, у імя лепшага жыцця на зямлі.

Алегарычнае апавяданне «У балоце» адрозніваецца ад іншых гэтага цыкла тым, што дзеючымі асобамі тут выступаюць людзі – мужыкі і паны. Сюжэт твора не складаны: панская брычка загразла ў балоце, сяляне і паны не могуць прыйсці да згоды ў пытанні выратавання гэтай брычкі. Я. Колас сваім творам дае магчымасць чытачу зразумець заканамернасці жыцця, законы чалавечага грамадства, прымушае задумацца над важнымі пытаннямі філасофскага і этычнага характару.

У казках «Адзінокае дрэва», «Зло – не заўсёды зло», «На чужым грунце», «Камень» асэнсоўваюцца прычыны аб'ектыўнага збегу абставін, без усведамлення якіх нельга адбудаваць жыццё.

Так, у алегорыі «Адзінокае дрэва» ўздымаецца праблема чалавечай адзіноты. Колас развенчвае эгаізм тых, хто ў пошуках абстрактнай прыгажосці і асабістага шчасця забывае інтарэсы іншых.

У творы «Зло – не заўсёды зло» аўтар асэнсоўвае праблему шчаслівай выпадковасці, якая можа забяспечыць жыццё. Да паняцця дабра і зла пісьменнік падыходзіць з пазіцый дыялектычнага іх разумення, як маральных катэгорый. Каштоўнасць алегорыі «Зло – не заўсёды зло» заключаецца ў тым, што Колас разглядае дабро і зло не як нешта вечнае, а як уяўленне, якое можа мяняцца, нават супярэчыць адно другому. Мастак слова гаворыць, што нават зло часта нясе ў сабе элемент дабра, а гэта і ёсць барацьба процілеглых пачаткаў, без чаго немагчымы дыялектычны працэс развіцця.

У апавяданні «На чужым грунце» раскрываецца праблема асуджанасці прарасці на чужым полі. Лёс закінуў зерне на чужыну , а жыццё здзекуецца з яго.

Філасофскія і маральныя пытанні жыцця і яго з'яў, руху як неабходнай умовы існавання прыроды і грамадства Я. Колас закранае нібы мімаходам, тым не менш яны выяўляюць яго погляды на катэгорыі быцця.

Навэла «Камень» прысвечана маральна-этычным праблемам канчатковасці быцця. Коласа-пісьменніка цікавіць вечны рух свету, г. зн. дыялектыка жыцця, згодна якой матэрыяльны свет знаходзіцца ў стане безупыннага руху, змянення і абнаўлення, калі заўсёды штосьці ўзнікае, штосьці разбураецца і адмірае.

Лёс каменя з аднаіменнай казкі лёгка асацыіруецца з лёсам чалавека. У сувязі з гэтым у чытача нараджаецца шмат думак аб сабе, аб знаёмых, суседзях і неяк незаўважна іншасказанне ў творы перарастае ў адпаведны роздум, развагі аб спазнанні людскога быцця, філасофіі вечнасці.

У казках-алегорыях пісьменнік ніколі не выказвае сваіх поглядаў на жыццё і розныя з'явы прыроды. Свае філасофскія думкі Я. Колас падае ў форме гутарак, дыялогаў прадстаўнікоў раслiннага і жывёльнага свету,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нежывой прыроды. Аднак алегарычнасць і філасафічнасць як сродкі мастацкага асэнсавання жыцця напоўнены значным зместам. Невялікія па аб'ёме творы напоўнены разнастайнымі і важнымі праблемамі жыцця.

У алегарычных творах «Хмарка», «Крыніца», «Даль» і інш. Колас гаворыць пра таемныя далі, што вабяць чалавека. Пісьменнік папярэджвае, што некаторыя ідэалы могуць быць фальшывымі. Такое зманлівае хараство аўтар асабліва ўдала развенчвае ў казцы «Даль».

Ліпаваму зерню, што расло на самай высокай галінцы, захацелася пакінуць дрэва і перабрацца ў прывабную даль: «Бывала, ледзь толькі ўзыдзе сонца, ледзь рассцелюцца на версе лясоў і ўзгоркаў яго залатыя абрусы, як гэтае зерне ўжо не зводзіць вачэй з сіняй далі. Што было ў ёй такога, чым прывабіла яна, гэтая даль, маладое ліпавае дзіця?.. У той бок, адкуль найлепш выглядала гэтая даль, беглі разлогі шырокіх палёў… Ціхія ўзгоркі, бы хвалі рачныя… Яшчэ далей, там, куды беглі срэбныя загібы бліскучай рэчкі і памыкаліся ўзгоркі, баравы лес і шырокае поле,.. . – была проста даль, якая так моцна парывае для сябе душу…» [1, с.4].

Аднак мары зернейка хутка развеяліся, як толькі яно пакінула сваю маці-ліпу. Усё хараство, якое здалёк здавалася ідэальным і ваблівым, паўстала перад ім у самым звычайным стане, з малюнкамі, якія нічым не адрозніваліся ад таго месца, дзе яно жыло на старой ліпе.

Праблема падманнасці, ілюзорнасці развенчваецца Я. Коласам і ў алегарычнай навэле «Балотны агонь». Маладая бярэзінка доўгі час жыла нейкай надзеяй на прывабны агонь, што блішчэў на балоце. Аднак вяз развеяў яе ілюзіі, сказаўшы, што гэта не сапраўдны агонь, а гнілякі, якія свецяцца ў начы.

Пісьменнік у творы пакідае адкрытым пытанне «ці добра зрабіў вяз, развеяўшы гэты прыгожы туман зманнага шчасця беднай бярэзінкі?» [1, с.25].

Аўтар гаворыць, што чалавек не павінен цешыць сябе ілюзіямі, жыць надзеяй на нязбытнае шчасце. Жыццё – рэч рэальная і кожны павінен зыходзіць у сваёй дзейнасці менавіта з гэтага.

Не мае пэўнага адказу пытанне, пастаўленае ў алегорыі «Што лепей?»: «…пражыць свой век ціха, спакойна, не пазнаўшы, як міла жыццё, ці пазнаць яго хараство і вартасць цаной вялікага няшчасця?» [1, с.45]. Я. Колас хоча разабрацца ў самацэннасці жыцця.

Павучальнай з'яўляецца і мараль твора «Гусі», выказанная адным з яго герояў: «Без змагання і няўдач нічога не дзеецца на свеце» [1, с.47]. Мастак слова выступае за актыўна-дзейсныя адносіны да жыцця, сцвярджае, што толькі ў імкненні наперад можна здабыць шчаслівую долю і пабудаваць асабісты лёс. Адсюль і паэтызацыя чалавека-змагара, чалавека-барацьбіта.

Творы з цыкла «Казкі жыцця» Я. Коласа заключаюць у сабе глыбокі ідэйны сэнс. Яны сведчаць аб выключнай жыццёвай мудрасці і назіральнасці пісьменніка.

Алегарычныя навэлы з цыкла «Казкі жыцця» вызначаюцца высокай мастацкай дасканаласцю. Адметнай іх рысай з'яўляецца тое, што ўсе яны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

напісаны вельмі лірычна, эмацыянальна. Гэтаму ў пэўнай меры садзейнічаюць аўтарскія лірычныя адступленні.

Я. Колас у «Казках жыцця» адухаўляе прыроду, надзяляе прадстаўнікоў расліннага свету жывымі рысамі: яны гавораць, думаюць, адчуваюць.

Цыкл «Казкі жыцця» - сапраўдная жамчужына ў беларускай літаратуры па глыбіні і маштабнасці пастаўленых аўтарам праблем і пытанняў чалавечага быцця.

Літаратура

1. Колас, Я. Казкі жыцця / Я. Колас. – Мінск : «Народная асвета», 1976. – 110 с.
2. Навуменка, І. Якуб Колас. Духоўны воблік героя / І. Навуменка. – Мінск : «Беларусь», 1968. – 336 с.
3. Чыгрын, І. Рэальнае і магчымае. Проза Якуба Коласа / І. Чыгрын. – Мінск : «Навука і тэхніка», 1991. – 222 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ